***Валянціна Яноўская,***

***кандыдат гістарычных навук, загадчык сектара гістарыяграфіі і метадаў гістарычнага даследавання Інстытута гісторыі НАН Беларусі, дацэнт***

# АДРАДЖЭННЕ ЦАРКОЎНЫХ ПРАВАСЛАЎНЫХ БРАЦТВАЎ У РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў 1860-Я ГАДЫ – ПАЧАТКУ ХХ СТ.

Аналізується проблема відродження церковних православних братств у Російській імперії в 1860-х рр. – на початку ХХ ст. і з'ясовуються причини відродження братств, відмінності в умовах і цільовій спрямованості їхньої діяльності порівняно з братським рухом кінця XVI – XVII століття.

***Ключові слова:*** *церковні православні братства, братський церковний рух, Російська імперія, Російська православна церква, землі колишнього Великого князівства Литовського, віруючі.*

У 60-я гг. ХІХ ст. у рэчышчы рускай праваслаўнай царквы адрадзіўся брацкі рух. Царкоўна-грамадская дзейнасць брацтваў на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) на працягу многіх стагоддзяў адыгрывала вялікую ролю ў жыцці праваслаўя, асабліва ў галіне духоўнай асветы. Але ў канцы ХVIII ст. у сувязі з рэзкай зменай палітычнага і канфесіянальнага становішча яны былі скасаваны, і толькі ў 1860-я гг. да іх зноў вырашылі звярнуцца. Галоўнай сваёй мэтай брацтвы ставілі данясенне да беларускага і украінскага насельніцтва думкі, што сапраўднай іх рэлігіяй з'яўляецца праваслаўе. Пачатак ХХ ст. характарызаваўся актыўным удзелам праваслаўных брацтваў у палітычным жыцці імперыі. Спектр пытанняў, што ставіўся перад брацтвамі, іх ідэалагічная скіраванасць ва ўмовах будаўніцтва «вялікай рускай нацыі», прадвызначаюць актуальнасць праблемы для сучаснай гістарыяграфіі.

Шэраг артыкулаў, якія змяшчаліся ў царкоўным і свецкім перыядычным друку, вялікая колькасць прац featured рознага кшталту аўтарства М. Каяловіча і А. Папкова, працы іншых аўтараў, што з'явіліся ў канцы XIX – пачатку ХХ ст.[1], даследаванні па гісторыі асобных брацтваў, або брацкага руху ў межах адной епархіі/губерні маладых навукоўцаў, што пачынаюць з'яўляцца ў сучаснай гістарыяграфіі[2], даюць магчымасць вывучаць праблему ў гістарычным развіцці і даволі ўсебакова Але палітычная заангажаванасць прац расійскіх даследчыкаў выклікае неабходнасць крытычнага перасэнсавання фактычнага матэрыялу ў адпаведнасці з сучаснымі гістарычнымі поглядамі украінскіх і беларускіх гісторыкаў. Што і з'яўляецца мэтай дадзенага артыкула.

Ідэя адраджэння праваслаўных брацтваў у Расійскай імперыі з'явілася ў 60-я гг. ХІХ ст. На першы погляд здавалася, што ідэя гэтая не мае пад сабой аб'ектыўнай падставы і наогул непатрэбная. Бо занадта ўжо рознымі былі палітычныя абставіны і тыя ўмовы, у якіх знаходзілася Праваслаўная царква на беларускіх і ўкраінскіх землях у складзе Рэчы Паспаталітай у канцы XVI–XVII стст. і тыя, што тычыліся другой паловы ХІХ ст. Само з'яўленне і існаванне

праваслаўных брацтваў у Беларусі і Украіне ў XVI–XVII стст. заўсёды звязвалася з неабходнасцю «защиты православного русского дела от польско-католицкого притеснения»[3]. Або, як сцвярджаў адзін з даследчыкаў і актыўных дзеячаў брацкага руху пачатку XX ст. А. Мілавідаў, царкоўныя інтарэсы былі ў той час нераздзельныя ад нацыянальных[4].

Перш за ўсё, тут, на наш погляд, трэба ўдакладніць, што разумець пад тэрмінам «православное русское дело» і аб якіх «нацыянальных» інтарэсах вялася гаворка. Бо ў адносінах да XVI ст., калі распачаўся праваслаўны брацкі рух, пад праваслаўнай рускай справай мелася зусім не тая Руская праваслаўная царква (РПЦ), што ў XIX ст. была ўключана ў добра вядомую трыадзіную формулу Уварава «праваслаўе, самаўладдзе, народнасць»[5]. І хоць трыада гэтая, як адзначаецца ў сучасных даследаваннях, ніколі не мела статуса дзяржаўнай ідэалогіі[6], на думку многіх, з'яўлялася ў той час фундаментам расійскай дзяржаўнасці.

Калі ж вярнуцца да больш ранняга перыяду, то ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі пераважае пункт погляду, што ад пачатку прыняцця хрысціянства і да сярэдзіны XVI ст. галоўнай сферай духоўнага фарміравання беларусаў (таксама як і ўкраінцаў) было праваслаўе ў яго «візанційска-славянскай традыцыі». «Бясспрэчным з'яўляецца факт, – сцвярджае Г. Галенчанка, – што так званае «рускае» насельніцтва ВКЛ (галоўным чынам беларусы, украінцы) захоўвала праваслаўныя візанційска-славянскія традыцыі[7]. Люблінская унія прынесла з сабой змены ў накірунку паступовага замацавання на гэтых землях пазіцый Рымска-каталіцкай царквы. Але пры ацэнцы рэлігійнага стану сярэдзіны XVI–XVII стст. у рэлігійна-навуковых колах XIX ст. панавала думка аб тым, што «это было время необыкновенного религиозного движения, охватившего все слои западно-русского православного населения и достигшего самых широких и никогда не бывалых размеров»[8].

Што ж тычылася другой паловы XIX ст., то землі былога ВКЛ ужо некалькі дзесяцігоддзяў знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі. Дзяржавы, дзе Праваслаўная царква займала пануючае месца сярод іншых канфесій. І гэта было замацавана як у заканадаўчым плане, так і ў іншых накірунках дзейнасці ўраду. Але падзеі 1830-х, а потым і 1860-х гг. яскрава прадэманстравалі, што ідэйны ўплыў каталіцтва на гэтых землях заставаўся ўсё яшчэ даволі моцным. Працягвала жыць у свядомасці беларускага і украінскага народа і уніяцкая ідэя. І хаця надзеі каталіцкага духавенства на тое, што гэта дапаможа прыцягнуць былых уніятаў на свой бок падчас паўстання 1863–1864 гг. не спраўдзіліся, рэшткі уніі працягвалі захоўвацца сярод насельніцтва і пасля паўстання. Часцей за ўсё гэта праяўлялася ў абрадах. Так, у справаздачы обер-пракурора Свяцейшага Сінода за 1883 г. у адносінах да праваслаўных вернікаў Мінскай епархіі гаварылася: «Старики, помнящие ещё унию, молятся большей частию "по-польски", менее усердны к церкви, посещают костёлы, а иногда отправляются с латинянами на богомолье в Царство Польское»[9]. Заставаліся рэшткі уніі і ў праваслаўных цэрквах Літоўскай епархіі – у упрыгожванні, якое не было ўласціва праваслаўным храмам, у выявах святых на іконах «в латинских одеяниях» і г. д. Калі ж да гэтых абставінаў дадаць і тое, што ў сілу гістарычных

варункаў склалася так, што праваслаўнае духавенства практычна згубіла да XIX ст. традыцыі выхавання і адукацыі моладзі на землях былога ВКЛ, то становіцца зразумелым, чаму ў 60-я гады XIX стагоддзя з'явілася ідэя аднавіць праваслаўныя брацтвы. Як і раней, яны павінны былі стаць тут апорай праваслаўя, спрыяць замацаванню праваслаўнай веры сярод мясцовага насельніцтва. Але зараз, у новых умовах, брацтвы ствараліся «зверху», ставячы галоўнай мэтай ідэалагічную – не толькі захаваць, але і пашырыць у так званых заходніх губернях Расійскай імперыі сацыяльную базу праваслаўя, як апору расійскай дзяржаўнасці і самаўладдзя.

8 мая 1864 г. былі «высачайша» зацверджаны асноўныя правілы для заснавання праваслаўных царкоўных брацтваў. Правілы акрэслілі кола дзейнасці брацтваў. Іх асноўнымі накірункамі былі вызначаны: процідзеянне замахам на правы праваслаўнай царквы з боку іншаверцаў і раскольнікаў, заснаванне і ўпрыгожванне праваслаўных храмаў, справа хрысціянскай дабрадзейнасці, распаўсюджванне і сцвярджэнне духоўнай асветы. Брацтвы ствараліся пры цэрквах і манастырах, мелі права захоўваць свае ранейшыя назвы. Статуты брацтваў зацвярджаліся епіскапам пасля атрымання станоўчага водзыва «начальніка губерні»[10]. Каб папярэдзіць магчымую самадзейнасць у гэтай справе, адзін з пунктаў правілаў (§7) папярэджваў: «Не допускается никаких отступлений от утвержденных для братств правил»[11].

Сярод тых, што аднаўляліся аднымі з першых: Люцынскае (Віцебская губерня) брацтва пры царкве Успення Багародзіцы; Іаана-Прадцечанскае Камянец-Падольскае (Падольская губерня); Астрожскае (Валынская губерня) Свята Кірыла-Мефодзіеўскае брацтва. У статуце Астрожскага брацтва адзначалася, што яно ставіла на мэце: «Возрождение православия и русской народности в западно-русском крае и очищение насколько возможно почвы православия от всякой примеси»[12]. Праўда, тут трэба мець на ўвазе, што пад «возрождением православия и русской народности» мелася зусім не тое праваслаўе ў яго «візанційска-славянскай традыцыі» і зусім не тое «рускае» насельніцтва ВКЛ, аб якім ішла гаворка вышэй.

У Беларусі адраджэнне царкоўных праваслаўных брацтваў пачалося з 1865 г. Менавіта ў гэтым годзе па хадайніцтву архіепіскапа Мінскага і Бабруйскага Міхаіла аднавіла сваю дзейнасць брацтва ў імя Свяціцеля Мікалая пры Мінскім Петра-Паўлаўскім саборы. У склад брацтва ўвайшлі 3 ганаровых і 131 правадзейны член, ад якіх паступіла 1084 руб. грошай. Сярод духоўных асобаў, што ўнеслі найбольш значныя ахвяраванні былі: мітрапаліт Кіеўскі і Галіцкі Арсеній (50 руб.), архіепіскап Мінскі і Бабруйскі Міхаіл (25 руб.), архіепіскап Кішынёўскі Антоній (25 руб.) і інш. Сярод свецкіх асобаў найбольшы ўнёсак зрабілі Міхаіл Каткоў (50 руб.) і Міхаіл Каяловіч (38 руб.)[13]. Аб накірунках дзейнасці брацтва сведчаць ягоныя справаздачы, што амаль штогод друкаваліся ў «Минских епархиальных ведомостях». З іх відаць, што першапачаткова сродкі брацтва накіроўваліся, галоўным чынам, на «обустройство церквей». Што было актуальным для заходніх губерняў пасля паўстання 1863–1864 гг., закрыцця шэрагу касцёлаў і пераўтварэнні іх у праваслаўныя цэрквы.

Так, згодна справаздачы за 1871–1872 гг., больш за 20 % усіх наяўных сродкаў брацтва было накіравана на перабудову былога рымска-каталіцкага касцёла ў мястэчку Івянцы ў праваслаўную царкву. Другім артыкулам расходаў было аказанне матэрыяльнай дапамогі. Прычым звяртае на сябе ўвагу факт, што сярод атрымаўшых дапамогу найбольшыя сумы былі вылучаны тым, хто перайшоў у праваслаўную веру з каталіцтва, або «новокрещенным» яўрэям[14].

Больш актыўна, судзячы па архіўных и друкаваных крыніцах, дзейнічала праваслаўнае царкоўнае брацтва ў імя Свяціцеля Мікалая і прападобнай княжны Еўфрасінні ў Полацку. Брацтва было ўтворана ў 1867 г. і ставіла на мэце « охранение и утверждение спасительных истин и правил Православной христианской веры в православном народе Белорусского края»[15]. У 1877 г., адзначаючы дзесяцігоддзе свайго існавання, братчыкі падводзілі вынікі дзесяцігадовай дзейнасці. У склад брацтва ўваходзіла 123 члены (1 ганаровы папячыцель брацтва, 8 членаў савета, 9 членаў-заснавальнікаў, 55 ганаровых членаў, 56 братчыкаў). За дзесяць гадоў сабрана больш за 21 тыс. руб. На гэтыя сродкі было падрыхтавана 20 народных настаўнікаў, аказвалася дапамога жаночай бясплатнай школе ў Полацку, утрымлівалася багадзельня на 10–12 чалавек. Брацтва штогод аказвала дапамогу бедным вучням Полацкага духоўнага вучылішча, выплачвала стыпендыі семінарыстам Полацкай настаўніцкай семінарыі[16].

Свой адметны накірунак дзейнасці імкнулася вызначыць Іаана-Прадцечанскае Камянец-Падольскае праваслаўнае брацтва. Утворане ў 1864 г., яно ставіла сваёй галоўнай задачай «служить делу благотворения, призрения и образования сирот». Дзеля ажыццяўлення гэтай задачы брацтва заснавала рамесную школу з майстэрнямі на 30 вучняў і асобна школу для дзяўчынак на 20 вучаніц, лічачы, што «одно призрение или раздача пособий далеко не принесет такой пользы, как воспитание бедных сирот из народа и техническое их образование, которые со временем могут обеспечить их существование»[17].

Дзейнічалі і іншыя праваслаўныя брацтвы: Віцебскае брацтва Св. роўнаапостальнага князя Уладзіміра, Магілёўскае Богаяўленскае брацтва, Віленскае Свята-Духава і інш. У справаздачы обер-пракурора Свяцейшага Сінода ім давалася наступная характарыстыка: «Существующие в западных епархиях братства продолжают с учётом своих средств служить делу православия, содействовать упорядочению православных храмов, поддерживают школы и учебно-воспитальные учреждения и оказывают материальную помощь тем членам православной церкви, которые имеют в этом необходимость»[18].

Аднак шырокай дзейнасці сярод вернікаў брацтвы праводзіць не маглі. Перш за ўсё па прычыне сваёй беднасці. Ганаровыя члены брацтваў, зрабіўшы першы даволі вялікі ўнёсак, заставаліся ганаровымі і надалей. Але, як правіла, іх першы ўнёсак быў адначасова і апошнім. Таму сродкі брацтваў былі абмежаванымі, што асабліва адчувалі тыя з іх, якія працавалі больш актыўна ў накірунку народнай (агульнай або прафесійнай) адукацыі. Некаторым з іх аказвалася дапамога з боку імператрыцы і іншых членаў імператарскай сям'і, выдзяляліся сродкі Свяцейшым Сінодам. У 1873 г., напрыклад, Свяцейшым Сінодам было

адпушчана па 250 руб. васьмі брацтвам заходніх губерняў у падтрымку школ. Полацкаму брацтву Свяціцеля Мікалая і прападобнай Еўфрасінні выдзелена 450 руб. на ўтрыманне стыпендыятаў брацтва ў Полацкай настаўніцкай семінарыі, а ў 1877 г. гэтая сума была павялічана ўдвая[19].

Зразумела, што гэтая дапамога была недастатковай. Няхватка грошай вымушала саветы брацтваў шукаць сродкі іншымі шляхамі, у тым ліку і за межамі сваёй губерні. Напрыклад, у адрас святароў і вернікаў Мінскай губерні неаднаразова звярталіся з просьбай аб дапамозе саветы Камянец-Падольскага і Рыжскага Пятра-Паўлаўскага праваслаўных брацтваў[20]. Для ажыўлення дзейнасці брацтва ў імя Свяціцеля Мікалая пры Мінскім Пятра-Паўлаўскім саборы было вырашана аб'яднаць яго з епархіальным вучылішчным саветам, каб дапамагаць у справе адукацыі. Аб'яднанне адбылося ў 1888 г., што знайшло адлюстраванне ў статуце брацтва. Праўда, і пасля гэтага работа вялася ў даволі сціплых памерах, бо як адзначалася ў справаздачы брацтва за 1897/1898 гг. «рассчитывать на пожертвования светских людей не приходится»[21].

Новы ўздым і адначасова новы накірунак дзейнасці атрымалі царкоўныя праваслаўныя брацтвы на пачатку ХХ ст. Падставай паслужыў «Именной Высочайший Указ Правительствующему Сенату» ад 17 красавіка 1905 г., які атрымаў у гістарычнай літаратуры шырокую вядомасць пад назвай «Указ аб верацярпімасці». Абвяшчэнне ўказу выклікала вялікае незадавальненне з боку праваслаўнага духавенства ўсіх рангаў. Усе яны непакоіліся галоўным чынам па адной прычыне. Паколькі ніякіх рэформ у Праваслаўнай царкве на той час не адбылося і яна была не гатовая да змены канфесіянальнага курсу палітыкі ўрада, то ўсе іншыя канфесіі апынуцца ў лепшым становішчы, чым праваслаўная. Сярод «выратавальнікаў» сітуацыі бачыліся праваслаўныя брацтвы. І калі яшчэ ў папярэднія гады брацтвы працягвалі больш непакоіцца аб тым, каб дапамагчы юнакам і дзяўчынам атрымаць адукацыю і прафесійныя навыкі, то пасля гэтага ўказу галоўныя мэты былі скіраваны на іншы аспект: «объединение всех православных русских людей для защиты Православной веры, Русской государственности и Русской народности»[22].

Даволі яскрава змена накірунку праяўляецца пры супастаўленні мэтаў праваслаўных брацтваў, што былі створаны ў адным г. Пінску, адно – напярэдадні ўказа, другое – праз колькі год пасля яго выхаду. Так, праваслаўнае брацтва Казанскай іконы Божай Маці было створана пры Пінскім духоўным вучылішчы. У ягоным статуце, зацверджаным 12 лістапада 1903 г., недвухсэнсоўна адзначалася: «Братство имеет первою и основною целью оказывать вспомоществование нуждающимся воспитанникам Пинского духовного училища, второю – религиозно-нравственное и эстетическое развитие учащихся...»[23]. Статут Пінскага праваслаўнага брацтва ў імя Св. вялікамучаніка Феадора Цірона, што пачало дзейнічаць у 1911 г., сваёй мэтай вызначыў: «всегда стоять на страже интересов православия и русской народности»[24].

Новы накірунак дзейнасці праваслаўных брацтваў пачатку ХХ ст. праслежваецца не толькі ў вызначэнні устаўных мэтаў, але і праз іх рэалізацыю. Асабліва яскрава гэта праявілася пад час выбараў у трэцюю Дзяржаўную Думу,

у ходзе якіх брацтвы заходніх губерняў зрабіліся «выразителями общественного мнения всего русского населения отдельных губерний»[25] . Другі брацкі з'езд, што адбыўся ў Вільні ў 1909 г., пастанавіў па магчымасці стварыць брацкія арганізацыі ва ўсіх праваслаўных прыходах. Цяжка сказаць, на колькі ўдалося выканаць гэтую пастанову ў маштабе ўсёй імперыі, або нават у маштабе ўсіх заходніх губерняў, але адно бясспрэчна – іх колькасць у гэты перыяд значна павялічылася. Напрыклад, у 1912 г. толькі ў адным Мінскім павеце мелася 14 брацтваў, дзейнасць якіх выражалася ў «собеседовании с прихожанами о значении православной религии, русского государства» і г. д.[26]

Што ж тычылася тых арганізацый, якія былі створаны раней, ў 1860-я гг., то і яны пачалі ўносіць змены ў свае статуты. Так, мінскае брацтва ў імя Свяціцеля Мікалая ў 1909 г. прыняло новы статут, што было патлумачана ў рэдакцыйным артыкуле часопіса «Православный братчик» рэзкімі зменамі ўмоваў рэлігійнага і грамадзянскага жыцця. Змены гэтыя бачыліся выдаўцам і праваслаўным іерархам у ажыўленні рымска-каталіцкай канфесіі на беларускіх і ўкраінскіх землях, а, галоўнае, у той небяспецы, што, на іх думку, несла гэтае ажыўленне. У такіх абставінах і было вырашана ўдыхнуць у брацкі рух «новае дыханне», успомніўшы яго першапачатковыя мэты: «Явление в истории небывалое: всякий раз как жизнь по тем или иным причинам выходит из обычного своего уклада, оживляется или затухает отношение людей к своим организациям, надвинувшаяся волна католицизма после указа 1905 года вновь, как и в далеком прошлом, заставила православное население обратиться к оплоту против иноверия – братствам»[27] .

Такім чынам, у дзейнасці царкоўных праваслаўных брацтваў на беларускіх і ўкраінскіх землях яскрава вылучаюцца тры этапы: 1) канец XVI–XVII стст.; 2) аднаўленне брацтваў у 1860-я гг. – да красавіку 1905 г.; 3) стварэнне шырокай сеткі новых брацтваў і рэарганізацыя накірунку дзейнасці ранейшых арганізацый пасля ўказу 17 красавіка 1905 г. І калі на другім этапе брацкія арганізацыі, нават з улікам ініцыятывы іх стварэння «зверху» неслі станоўчы зарад, удзяляючы ўвагу замацаванню пазіцый праваслаўя праз адукацыю народа, то трэці этап можна ахарактарызаваць як цалкам палітызаваны. Звяртаюць на сябе ўвагу і такія абставіны: знаходзячыся ў лепшых умовах чым раней, дзейнасць брацтваў другога і трэцяга этапаў была значна менш эфектыўнай і многія з іх існавалі толькі на паперы, ствараючыся галоўным чынам у адказ на рашэнні Свяцейшага Сінода. Што да беларускай тэрыторыі, то славуты індэферэнтызм беларускага народа, які складваўся на працягу стагоддзяў пад уплывам неабходнасці мяняць час ад часу веру бацькоў, сказваўся і тут, у падтрымцы, матэрыяльнай і іншай, царкоўных праваслаўных брацтваў. Думаецца, дадзеную выснову можна распаўсюдзіць і на ўкраінскую тэрыторыю. Згодна со сцверджаннем украінскага даследчыка Г. Цямка, «Неприйняття частиною украпнців росіян та офіційного російського православ'я привело до появи та поширення серед народу антиросійських та антиклерикальних настропв, релігійного скептицизму, індиферентизму»[28] . Красамоўным пацверджаннем дадзенай высновы з'яўляецца, на наш погляд, і тое, што на другім брацкім

з'ездзе (1909 г.) адзін са шматлікіх дакладаў нават самой сваёй назвай ставіў гэтае актуальнае для заходніх губерняў пытанне: «Почему тает православие и падает русская государственность на окраинах?».

1 Миловидов А. И. Западнорусские православные братства, их современное значение и задачи / А. И. Миловидов. – Вильна: Тип. «Русский почин», 1912; Труды съезда представителей западнорусских православных братств, состоявшегося в Минске 29–31 августа 1907 г. – Минск: Тип. С. А. Некрасова, 1908; Труды съезда представителей западнорусских православных братств, состоявшегося в городе Вильне по инициативе Виленского Свято-Духовского братства 2–5 августа 1909 года. – Вильна: Тип. «Русский почин», 1909.

2 Гажва И. А. Религиозно-просветительская деятельность православных братств Центральной России во второй половине XIX – начале XX вв.: на материалах Владимирской и Костромской губернии: дис. … канд. ист. наук: 07.00.00 / И. А. Гажва. – Иванова, 2008; Восович С. М. Православные братства Полоцкой епархии в 1861–1914 гг. / С. М. Восович // Вестник Брестского государственного технического университета. – 2009. – № 6. – С. 34–38.

3 Пятидесятилетие Острожского Св. Кирилло-Мефодьевского православного церковного братства. 1865–1915 гг. – Петроград: Тип. В. Ф. Киршбаума, 1915. – С. 1.

4 Миловидов А. И. Западнорусские православные братства… – С. 8.

5 Володина Т. А. Уваровская триада и учебники по русской истории / Т. А. Володина // Вопросы истории. – 2004. – № 2. – С. 117.

6 Полунов А. Ю. Рец. на книгу «О религии в империи: миссии, обращения и веротерпимость в царской России». Лондон, 2001 / А. Ю. Полунов // Отечественная история. – 2003. – № 5. – С. 210.

7 Галенчанка Г. Я. Еўрапейскія сувязі Беларусі ў этна-культурным і духоўным кантэксце (XIII – сярэдзіна XVII ст.) / Г. Я. Галенчанка. – Мінск: ЗАО «Пропилей», 1998. – С. 6.

8 Бердницкий Н. Литературная полемика православных с протестантами в юго-западной России в XVI и XVII вв. / Н. Бердницкий // Минские епархиальные ведомости. – 1888. – № 1. – С. 1.

9 Извлечение из всеподданнейшего отчета Обер-Прокурора Св. Синода за 1883 г. // Литовские епархиальные ведомости. – 1883. – № 4. – С. 39.

10 Основные правила для учреждения православных церковных братств // Мысли белорусса о братствах в год празднования благодарным потомством тысячелетнего юбилея памяти славянских просветителей святых равноапостольных Кирилла и Мефодия. – СПб.: Тип. тов-ва «Общественная польза», 1885. – С. 11–12.

11 Там же. – С. 12.

12 Цыт. па: Жилюк С. І. Російська церква на Волині (1793–1917 рр.) / С. І. Жилюк. – Житомир: Журфонд, 1996. – С. 53.

13 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі г. Мінск (далей НГАБМ). – Ф. 562. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 1, 2, 7.

14 Отчет Минского Православного Николаевского братства за 1871–1872 годы // Минские епархиальные ведомости. – 1873. – № 2. – С. 27.

15 НГАБМ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 33400. – Арк. 10.

16 Отчет Полоцкого во имя Святителя Николая и Преподобной княжны Евфросинии православного братства за 1867–1877 годы // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1878. – № 17. –С. 117, 128.

17 От Совета Иоанно-Предтеченского Каменец-Подольского Братства // Минские епархиальные ведомости. – 1873. – № 2. – С. 43, 44.
18 Извлечение из всеподданнейшего отчета Обер-Прокурора Св. Синода графа Д. Толстого за 1873 г. // Литовские епархиальные ведомости. – 1875. – № 4. – С. 35.
19 Там же.
20 НГАБМ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 4335. – Арк. 2.
21Там же. – Ф. 562. – Воп. 1. – Спр. 4. – Арк. 206.
22 Там же. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 8060. – Арк. 334 зв.
23 Устав Братства Казанской Иконы Божией Матери для вспомоществования нуждающимся ученикам Пинского духовного училища. – Пинск: Типо-Литография Вильковича, 1904. – С. 1.
24 Устав Пинского православного братства во имя Св. великомученика Феодора Тирона. – Пинск: Паровая Типо-Литография Вильковича, 1911. – С. 1.
25 Миловидов А. И. Западнорусские православные братства… – С. 3.
26 НГАБМ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 8060. – Арк. 330 зв.
27 От редакции // Православный братчик. – № 1. – 1910. – С. 3.
28 Темко Г. Д. Третій Рим: імперія проти Украпны. Історико-політичний нарис / Г. Д. Темко. – К.: Міжнародна агенція «BeeZone», 2004. – С. 123.

**Summary**
**Valiantsina Yanouskaya**
RESTORATION OF ORTHDOX CHRSTIAN CHURCH BROTHERHOODS
IN RUSSIAN EMPIRE DURING 1860IES – EARLY XXTH CENTURY
The author describes the process of restoration of Orthdox Chrstian church brotherhoods in Russian Empire during 1860ies – early XXth century. The article is focused on the analysis of the reasons for restoration, and on differences between contexts and objectives of XIXth century and XVIth–XVIIth brotherhoods' activities.

***Лариса Моісєєнко,***

***кандидат історичних наук, доцент кафедри***
***СГП Красноармійського індустріального інституту***
***державного вищого навчального закладу***
***«Донецький національний технічний університет»***

# ГОСПОДАРСЬКА ДІЯЛЬНІСТЬ ХРИСТИЯНСЬКИХ КОНФЕСІЙ В ДОНБАСІ В КІНЦІ ХІХ – НА ПОЧАТКУ ХХ СТ.

Розглянуто господарську діяльність християнських конфесій в Донбасі в кінці ХІХ – на початку ХХ століть. Проаналізовано види господарської діяльності християнських конфесій; визначено специфіку, результативність та ефективність цієї діяльності; з'ясовано фактори, що сприяли або заважали економічній діяльності християнських конфесій.

***Ключові слова:*** *економічна діяльність, християнські конфесії, духовенство, єпархія, консисторія, церковно-майнове право.*